# Сістэмныя выклікі для беларускага грамадства і ўрада ў перыяд палітычных змен у Беларусі

## Эсэ выпускніка курсу “Публічная палітыка для пачаткоўцаў”

Мы з вамі жывем у выдатную эпоху, дзе ў нас ёсць магчымасць змяніць лёс нашай Беларусі. Безумоўна, пасля разбурэння дыктатуры нас чакаюць складаныя задачы дэмакратызацыі і рэформаў, але спачатку трэба дэмантаваць рэжым Лукашэнкі. Таму, на маю думку, было б важным акрэсліць стратэгію прыгатаванняў да будучых пераменаў.

У 2020 годзе мы ўдзельнічалі, на жаль, у няўдалай спробе вызвалення Беларусі - абапіраючыся выключна на законны і мірны шлях вулічных пратэстаў, мэтай якіх ставіўся пераход дзяржаўных службоўцаў з боку рэжыма на бок народа. Але ў гэтай стратэгіі існуе два галоўных мінусы:

1. Пакуль рэжым падтрымліваецца Расеяй, у чыноўнікаў амаль няма матывацыі рызыкаваць - яны адчуваюць, што ў выпадку поспехаў пратэстоўцаў у Беларусь будуць уведзеныя Расейскі АМАП і войскі, і пратэст будзе лёгка задушаны.

2. Бяз замены большасці дзяржаўнага апарату, галоўнай рысай якога з’яўляецца лаяльнасць, а не кваліфікаванасць, немагчыма ажыццяўленне неабходных рэформаў і эфектыўнае кіраванне дзяржавай.

На маю думку, пачынаць падрыхтоўку да перамен патрэбна з працы з дэпалітызаваным насельніцтвам унутры краіны - без удзелу грамадства перамены немагчымы. Зараз, па маіх назіраннях, большасць людзей сочыць альбо за беларускімі, альбо за расейскімі дзяржаўнымі СМІ - нават не заўсёды за палітычнымі, а хутчэй за забаўляльным кантэнтам. Беларускім нацыянальна-дэмакратычным СМІ трэба вышукваць сродкі, рэарганізоўвацца і разбаўляць палітычны кантэнт забаўляльнымі шоу дзеля пашырэння аўдыторыі.

На вялікі жаль, зараз ва Украіне ідзе жудасная вайна, у якой кожны дзень гінуць дзясяткі, калі ня сотні людзей, але для Украіны і Беларусі гэта шанец як мінімум на бліжэйшы час паслабіць Расею і здабыць сваю свабоду. У выпадку паразы Расеі і пачатку ўнутранай смуты ёй будзе не да Беларусі, таму рэжым Лукашэнкі застанецца без падтрымкі. Гэтай магчымасцю можна будзе скарыстацца.

Трэба ўжо зараз рыхтавацца да магчымага грамадскага выбуху ў Беларусі, рэкламаваць тактычную падрыхтоўку людзей (полк Каліноўскага, харугвы) і распрацоўваць стратэгію ўдзелу гэтых фармаванняў для падтрымкі пратэстоўцаў.

Таксама з таго, што можна рыхтаваць ужо зараз - новыя кадры для дзяржаўнага апарату новай Беларусі. Вельмі істотна будзе замяніць значную колькасць некампетэнтных бюракратаў на людзей, якія прагнуць змяніць Беларусь да лепшага. Хоць такіх людзей, я веру, многа, але іх таксама трэба навучыць таму, як працуе

ўлада, бюджэт, дзяржаўныя праграмы і гэтак далей. Можна было б паспрабаваць дамовіцца з урадамі Польшчы і Літвы аб праграмах па тэарэтычнай і, што больш важна, практычнай (у супрацы з чыноўнікамі гэтых краінаў) падрыхтоўцы кадраў для новай Беларусі.

Дапусцім, перамены атрымаліся і ў Беларусі кааліцыйны нацыянальна-дэмакратычны ўрад. Перад ім адразу паўстае дзве асноўныя праблемы: інтэрвенцыя з боку Расеі, якая з высокай верагоднасцю можа адбыцца пасля заканчэння ў ёй смуты, і незадаволенасць вялікай часткі беларускага насельніцтва, якая можа прывесці да адкату назад.

Дзеля супрацьстаяння Расеі абавязкова спатрэбіцца захаваць і ўмацаваць баяздольнасць войска, а таксама спецслужбы - бяз іх існавання Расея ўкараніць вялікаю колькасць сваёй агентуры па ўсёй Беларусі. Гэта будзе патрабаваць вялікіх рэформаў, супрацы са спецыялістамі Украіны і Альянсу, а таксама, безумоўна, вялікіх грашовых выдаткаў на абарону (улічваючы сённяшні стан беларускага войска і прыклады краін свету - Ізраіль, Украіну - ня менш за 10% ВУП штогод).

Калі казаць пра незадаволенасць новым урадам і яго палітыкамі часткі насельніцтва, важным пытаннем і праблемай паўстае грамадскі раскол як следства падзей 2020 года. Першай мерай пераадолення гэтага расколу павінна стаць агульнае асэнсаванне злачыннасці рэжыму Лукашэнкі - трэба ўжо зараз гатаваць і абгрунтоўваць юрыдычныя абвінавачванні крымінальных спраў за гвалт, рэпрэсіі, карупцыю, фальсіфікацыю выбараў і г.д. Вельмі важна, каб гэтыя працэсы выглядалі абсалютна чэснымі і абгрунтаванымі, каб не было ўражання, што гэта крыўда і помста за мінулыя падзеі.

Таксама будзе важным прасоўваць ідэі беларусізацыі - адзіная дзяржаўная мова, беларускамоўны дзяржаўны апарат, дзяржаўныя праграмы для падтрымкі беларускамоўных фільмаў, тэатраў і літаратуры. Але вельмі важна прасоўваць гэтыя ідеі павольна - абсалютна нельга прымушаць людзей карыстацца толькі беларускай мовай ці забараняць рускамоўныя СМІ - вельмі верагодна, што гэта выкліча толькі абурэнне большай часткі грамадзян. Тое ж самае павінна адбыцца з дэсаветызацыяй - замена помнікаў, назваў вуліц, пераасэнсаванне гісторыі павінна адбывацца толькі пасля абмеркавання з мясцовай грамадзянскай супольнасцю і насельніцтвам.

Вельмі важнай будзе і палітычная адукацыя, у тым ліку і дарослых грамадзян. Яскравым прыкладам з’яўляецца некамерцыйная платформа “Нацыя Лідараў”, у свабоднай Беларусі такіх арганізацый абавязкова з’явіцца яшчэ больш.

Безумоўна, найбольш важным фактарам для задавальнення ўсіх жыхароў Беларусі будзе хуткі рост эканомікі, які пацягне за сабой павялічэнне заробкаў як прадпрымальнікаў, так і працоўных. Дзеля яго забеспячэння спатрэбіцца шэраг палітычных і эканамічных рэформаў.

Пачаць, відавочна, прыйдзецца са змены канстытуцыі. Сённяшняя незаконна змененая канстытуцыя надзяляе прэзідэнта амаль неабмежаванымі паўнамоцтвамі, і любы палітык на гэтай пасадзе праз некаторы час гарантавана стане Лукашэнкам 2.0. Каб не дапусціць гэтага, трэба забяспечыць сапраўднае раздзяленне ўладаў - альбо

зрабіць прэзідэнта дэкаратыўнай пасадай і пераўтварыць Беларусь у парламенцкую рэспубліку, альбо адабраць у яго магчымасць ствараць законы і распускаць парламент.

Таксама для дэцэнтралізацыі ўлады трэба ўмацаваць пазіцыі мясцовай улады - зрабіць іх выбарчымі (пачыная ад сельскай рады і скончваючы мэрам Менска) і накіроўваць частку падаткаў у мясцовыя органы, мінаючы рэспубліканскі ўрад. Патрэбна магчымасць выбіраць суддзяў і начальнікаў паліцыі - гэта дапаможа пераадолець праблему даверу да судовай і праваахоўнай сістэмаў у выніку рэпрэсіяў пасля 2020 году.

Калі казаць пра эканамічныя рэформы, аналізуючы сусветны досвед, становіцца зразумела - нішто не паляпшае эканамічны стан грамадства так якасна і хутка, як свабодны рынак. Цяперашнюю эканоміку Беларусі - з вялікай дзяржаўнай уласнасцю, шматлікімі праверкамі бізнэсу, карумпаванасцю і непад'ёмнымі падаткамі (згодна са статыстыкай, з кожнага рубля звычайны беларус аддае каля 50 капеек падаткаў дзяржаве) - прыйдзецца радыкальна рэфармаваць, каб мець высокія паказчыкі росту ВУП і дазволіць выдзяляць вялікія сродкі на войска.

Можна шмат казаць, як трэба правесці гэтыя рэформы: прыватызацыя і падатковая рэформа, дэбюракратызацыя і пенсійная рэформа, лічбавы ўрад і змены ў заканадаўстве - усё гэта дакладна спрацуе, калі ўлічваць поспехі і памылкі дзяржаў, якія ўжо прайшлі гэты шлях у мінулым. Але самымі галоўнымі праблемамі будуць нізкая палітычная і эканамічная адукаванасць грамадзян, якія могуць заблакаваць гэтыя рэформы, а таксама няўпэўненасць сусветных інвестараў у стабільнасці і законнасці нашай краіны ў першыя гады пасля палітычных змен.

Калі з адукаванасцю насельніцтва можна змагацца толькі з дапамогай папулярызацыі адукацыйных праграмаў і платформаў, то для прыцягнення ў Беларусь сусветных інвестараў можна акрэсліць стратэгію.

Па-першае, трэба пачаць з судовай рэформы. Любому прадпрымальніку, як беларусу, так і іншаземцу, вельмі важна бачыць, што дзяржаўны суд заўсёды чэсна вырашыць спрэчку наконт любога кантракту. Дзеля гэтага суддзя павінен быць незалежным, выбарчым, а пакараннем за хабар павінна быць канфіскацыя ўсёй маёмасці сям'і карупцыянера. Таксама як варыянт можна разглядзець суд прысяжных.

Па-другое, патрэбныя змены ў беларускім заканадаўстве. Я лічу важным паспрабаваць зрабіць з Беларусі “Амерыку 21 стагоддзя” - максімальна свабодную краіну, у якую будуць з'язджацца найбольш разумныя і прадпрымальныя людзі з усяго свету, а сусветныя карпарацыі будуць адкрываць свае вытворчасці. Пад свабодай я разумею свабоду слова (калі гэта ня ёсць прамы заклік да фізічнага гвалту), поўная адсутнасць праверак для прадпрымальнікаў, максімальна просты шлях да адкрыцця свайго бізнэсу праз лічбавы ўрад (прыклад - Грузія), свабода любых даследванняў, што паможа прыцягнуць сусветныя медыцынскія, фармацэўтычныя і сельскагаспадарчыя карпарацыі.

Таксама вельмі важна змяніць падатковае заканадаўства - значна знізіць агульную падатковую нагрузку (згодна з крывой Лаффера) і ўвогуле спрасціць падатковы кодэкс,

каб колькасць розных падаткаў не перавышала 5-7 (насамрэч, можна абысціся і меншай колькасцю), а сам кодэкс складаў менш за 10 старонак, каб любы прадпрымальнік змог без дапамогі юрыста ў ім разабрацца.

Падводзячы вынікі, Беларусі трэба прайсці цяжкі шлях да светлай будучыні, але гледзячы на колькасць разумных, сумленных, самаадданых грамадзян, якія ўжо прадэманстравалі сваю прагу да свабоды, мне здаецца, што мы вытрымаем гэтыя выпрабаванні і ў нас усё атрымаецца. Жыве Беларусь!